«Гэта нашы агульныя перамога, памяць і слава»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Вайна — гэта заўсёды кроў, жах і смерць. У гэтай нечалавечай, жорсткай рэальнасці бываюць рубяжы, супрацьстаянне на якіх аплачана неймавернай цаной. Ржэў — менавіта такое месца, таму што за ім была сталіца нашай Радзімы і ўся наша вялікая краіна. Тут гарэла зямля, плавіўся камень і крышылася браня, але не здаваўся савецкі салдат. Ішоў урукапашную ў жорсткай сутычцы з ворагам, калі заканчваліся патроны. Сцякаў крывёй на снезе ў люты мароз. Паміраў, але стаяў да смерці», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі прэс-служба Прэзідэнта.

Па словах кіраўніка нашай краіны, пакуль ствараем помнікі, ваяваць не будзем, пазбегнем гэтай страшнай трагедыі.

«Адкрыццё гэтага мемарыяла, урачыстасці ў расійскай сталіцы, мітынг-рэквіем у Брэсцкай крэпасці, парад 9 мая ў Мінску яшчэ раз паказваюць, што гэта нашы агульныя перамога, памяць і слава, якія мы і ў далейшым будзем свята захоўваць. Гэта і ёсць рэальная сувязь часоў і пакаленняў. Нябачная ніць, якая злучае сэрцы ўсіх народаў, што ваявалі ў той страшэннай вайне, і перш за ўсё беларусаў і расіян. З самай глыбокай удзячнасцю мы схіляем галаву перад мужнасцю і стойкасцю ўсіх, хто аддаў жыццё за свабоду цяперашніх і будучых пакаленняў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нашай краіны перакананы, што мемарыял Савецкаму салдату пад Ржэвам заўсёды будзе сімвалам непарушнай дружбы паміж Расіяй і Беларуссю, месцам усеагульнага гонару і пакланення перад подзвігам нашых дзядоў і прадзедаў.

Таксама ён падзякаваў стваральнікам помніка: кіраўніцтву Расійскай Федэрацыі, Пастаяннаму камітэту Саюзнай дзяржавы, ураду Цвярской вобласці, Расійскаму ваенна-гістарычнаму таварыству, творчаму калектыву і ўсім грамадзянам, якія ўзялі ўдзел у будаўніцтве.

Прэзідэнты Расіі і Беларусі высадзілі дзве елкі ў рамках міжнароднай акцыі «Сад памяці» і агледзелі экспазіцыю павільёна Цэнтральнага музея Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гадоў.

Мемарыяльны комплекс створаны каля вёскі Харошава Ржэўскага раёна Цвярской вобласці на народныя ахвяраванні з ініцыятывы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Мемарыял прысвечаны памяці савецкіх салдат, якія загінулі ў баях пад Ржэвам у 1942–1943 гадах. Галоўны аб'ект комплексу — 25-метровая скульптура салдата на насыпным кургане. Мемарыял — першы маштабны помнік савецкім воінам у сучаснай Расіі.

Меркаванне

У АСНОВЕ РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ НАЙЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ, СТАБІЛЬНАСЦЬ І ДАСЯГНУТЫЯ ВЫНІКІ

Валерый ГАЛУБОЎСКІ, рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт:

— Рэспубліка Беларусь сёння — гэта незалежная, суверэнная краіна, дзе створаны ўмовы для развіцця чалавека як асобы, прафесіянала і грамадзяніна, які валодае правамі і адказнасцю за будучыню сваёй краіны. Дзякуючы дзяржаўнай палітыцы, якая праводзіцца ў сістэме прафесійнай адукацыі, у суверэннай Беларусі не толькі захаваны найлепшыя дасягненні, але і штогод умацоўваецца патэнцыял прафесійных ліцэяў і каледжаў, адкрываюцца новыя высокатэхналагічныя спецыяльнасці, майстэрні і лабараторыі папаўняюцца самым сучасным абсталяваннем сусветнага ўзроўню. Для навучэнцаў і педагагічных работнікаў створаны ўмовы і магчымасці для асобаснага і прафесійнага развіцця. На міжнародных чэмпіянатах прафесійнага майстэрства па стандартах World Skills нацыянальная каманда Рэспублікі Беларусь за пяць гадоў удзелу паднялася з 37-га на 15-е месца сярод больш чым 80 краін-удзельніц, а ўчарашнія навучэнцы — канкурсанты сусветных чэмпіянатаў сёння прыходзяць працаваць ва ўстановы прафесійнай адукацыі ў якасці маладых спецыялістаў. Гэта толькі асобныя прыклады дасягненняў у сістэме прафесійнай адукацыі.

На жаль, у перыяд выбарчых кампаній усё большы паток інфармацыі ў інтэрнэт-рэсурсах накіраваны на крытыку, што робіцца ў краіне «не так», пры гэтым не гаворыцца пра тыя дасягненні, якія краіна здабыла ў перыяд станаўлення і развіцця незалежнай Беларусі ў такі кароткі па гістарычных мерках тэрмін. У аснове развіцця моцнай і квітнеючай Беларусі павінны быць найлепшыя традыцыі, стабільнасць і дасягнутыя вынікі, якія дазваляюць будаваць будучыню з адукаванымі маладымі людзьмі, прафесіяналамі і патрыётамі сваёй краіны.

Парламенцкі дзённік

ПРАФІЛАКТЫЧНЫЯ І ЛІБЕРАЛЬНЫЯ

Дэпутаты ў першым чытанні прынялі новыя КаАП і ПВКаАП

Новы Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях значна спрашчаюць адказнасць за парушэнні, змякчаюць пакаранні, зніжаюць верхнія і ніжнія межы штрафных санкцый, уводзяць новыя інстытуты адказнасці. Плануецца, што новыя законы пачнуць працаваць з пачатку будучага года. Праекты двух кодэксаў разглядалі на пасяджэнні другой сесіі Палаты прадстаўнікоў.

«Маецца на ўвазе новы падыход па катэгарызацыі правапарушэнняў — гэта праступкі, невялікія памылкі, якія дапускаюць грамадзяне, значныя правапарушэнні. І ў залежнасці ад таго, да якой катэгорыі будзе адносіцца тое ці іншае правапарушэнне, і будзе падыход да прызначэння пакарання», — расказала **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.**

У залежнасці ад ступені цяжкасці парушэнні падзелены на тры катэгорыі. Так, адміністрацыйнымі праступкамі будуць лічыцца парушэнні, за якія накладваецца штраф да 10 б. в. на фізічную асобу, да 25 б. в. на індывідуальнага прадпрымальніка і 50 б. в. на юрыдычную асобу. Другая катэгорыя — значныя адміністрацыйныя парушэнні, за якія накладваецца вышэйшы штраф ці прымяняюцца канфіскацыя, дэпартацыя. Апошнія — грубыя адміністрацыйныя правапарушэнні, — гэта паўторныя правапарушэнні, якія могуць цягнуць крымінальную адказнасць, ці асоба за іх можа быць прыцягнута да адміністрацыйнага арышту, пазбаўлення спецыяльнага права ці права займацца пэўнай дзейнасцю. За грубыя парушэнні (хуліганства, крадзеж, гвалт, масавыя беспарадкі) захоўваюцца жорсткія меры адказнасці, аж да арышту.

Праект прадугледжвае новую меру адміністрацыйнага спагнання — грамадскія работы. Яе ўвядзенне ў кодэкс абумоўлена неабходнасцю наяўнасці немаёмаснага спагнання, альтэрнатыўнага арышту. Такое спагнанне будзе накладваць суд са згоды адказнай асобы. Тэрмін магчымых бясплатных работ — ад 8 да 60 гадзін.

«За такое сур'ёзнае парушэнне, як кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым выглядзе больш чым з 0,8 праміле алкаголю, адказнасць прапаноўваецца ўзмацніць удвая. То-бок прапануецца прымяняць штраф у памеры 5400 рублёў з правоў кіроўцы на пяць гадоў. Раней было тры гады», — паведаміў **Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.**

Дарэчы, па выніках работы і грамадскага абмеркавання члены межведамаснай рабочай камісіі прыйшлі да высновы, што ўвядзенне бальнай сістэмы ацэнкі паводзін кіроўцаў на дарозе дачаснае.

Галоўная асаблівасць кодэксаў, па словах дырэктара Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, — прафілактычны і папярэджвальны характар нормаў. Сярод іх вусныя заўвагі, папярэджанне, меры выхаваўчага ўздзеяння на непаўналетніх. Прафілактычныя меры будуць прымяняць замест адміністрацыйнай адказнасці.

«Ключавая асаблівасць прафілактычных мер уздзеяння — адсутнасць прававых наступстваў прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці. То-бок асоба, да якой прыменены прафілактычныя меры ўздзеяння, не будзе лічыцца асобай, якая прыцягвалася да адміністрацыйнага спагнання», — сказаў Вадзім Іпатаў.

Яшчэ адной навелай стала падрабязная рэгламентацыя вядзення працэсу ў адносінах да непаўналетніх. У новым КаАП паменшана колькасць неактуальных складаў правапарушэнняў, якія на працягу апошніх трох гадоў амаль не прымяняліся, і скарочаны пералік органаў і службовых асоб, якія маюць права складаць пратаколы аб правапарушэннях.

Адміністрацыйная адказнасць не будзе прымяняцца за асобныя падатковыя і мытныя дзеянні пры ўмове выпраўлення іх не пазней чым праз 10 дзён з моманту выяўлення правапарушэння.

Работа над лібералізацыяй новых кодэксаў вялася шырокай супольнасцю — юрыстамі, навукоўцамі, прадстаўнікамі органаў улады, дэпутатамі на працягу шасці месяцаў. Праекты КаАП і ПВКаАП унесены ў ніжнюю палату парламента Прэзідэнтам і падрыхтаваны ў выкананне яго даручэння, дадзенага на нарадзе 16 снежня 2019 года.

Марыя ДАДАЛКА.

З нагоды

ГЭТЫЯ ЛЮДЗІ Ў КОЖНАГА З НАС У СЭРЦЫ

Найлепшых медыцынскіх работнікаў краіны ўшанавалі ў Савеце Рэспублікі

За значны ўнёсак у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі краіны, шматгадовую добрасумленную працу ў галіне аховы здароўя Ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Беларусі ўзнагародзілі медыцынскіх работнікаў кожнага рэгіёна і сталіцы — усяго 36 чалавек. Ганаровая цырымонія адбылася перад пачаткам заключнага пасяджэння другой сесіі Савета Рэспублікі.

Спікер верхняй палаты парламента выказала шчырыя словы ўдзячнасці за тую вялікую і патрэбную грамадству місію, якую штодзень выконваюць гэтыя людзі.

— Гэты год стаў асаблівым для медработнікаў. Тая бяда, якая прыйшла практычна ва ўсе краіны свету і ў тым ліку ў Беларусь, па-новаму прымусіла нас паглядзець на работу людзей у белых халатах. І канешне, у гэтыя дні кожны па-асабліваму выказваў ім удзячнасць. Мы бачылі гэта з тэлеэкранаў, чыталі са старонак газет. Мяркую, што гэтыя людзі ў кожнага з нас у сэрцы. З першых дзён з'яўлення чалавека на свет яны суправаджаюць нас і на працягу ўсяго жыцця робяць усё для таго, каб мы маглі спакойна жыць і працаваць, — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава выказала ўдзячнасць медыцынскім работнікам за адданую работу і адзначыла, што іх штодзённая праца нароўні з подзвігам — цяжкая і адказная.

— Сёння Прэзідэнтам робіцца ўсё магчымае для таго, каб стварыць годныя ўмовы для работы медыцынскіх работнікаў: будуюцца і рэканструююцца бальніцы, набываецца новае сучаснае абсталяванне. Але няма нічога важнейшага за таленавітыя рукі, розум тых людзей, якія суткамі знаходзяцца каля ложка хворага, даюць нам надзею на жыццё. Таму нізкі вам паклон і ўдзячнасць, — адрасавала яна цёплыя словы медработнікам. Спікер верхняй палаты парламента дадала, што для яе гэтая асаблівая нагода па ўшанаванні найлепшых працаўнікоў галіны аховы здароўя краіны.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі выяўлены небяспечны вірус, які пагражае новай пандэміяй

Навукоўцы ў Кітаі ідэнтыфікавалі новы штам віруса грыпу, які валодае сур'ёзным патэнцыялам да ўзнікнення пандэміі. Вірус выяўлены зусім нядаўна, яго разносчыкам выступаюць свінні, аднак ён здольны заражаць і людзей. Даследчыкаў турбуе, што штам можа мутаваць далей і гэта дазволіць яму з лёгкасцю перадавацца ад чалавека да чалавека, выклікаўшы новую глабальную эпідэмію, перадае «Бі-бі-сі». Па словах навукоўцаў, хоць на цяперашні момант сітуацыя яшчэ не стала пагрозлівай, новы патаген валодае ўсімі тыповымі характарыстыкамі, якія паказваюць на высокую ступень прыстасаванасці да заражэння чалавека, і патрабуе пільнага кантролю. Асаблівасць знойдзенага віруса ў тым, што ён цалкам новы, не падобны на іншыя і ўстойлівасць да яго ў людзей альбо вельмі нізкая, альбо яе няма зусім.

У Сіэтле праводзяць лётныя выпрабаванні лайнера Boeing 737 MAX

Гэта апошні важны этап на шляху вяртання сумна вядомай мадэлі ў неба пасля амаль 15 месяцаў прастою. Яе эксплуатацыю спынілі пасля дзвюх авіякатастроф. 29 кастрычніка 2018 года ў Інданезіі разбіўся лайнер кампаніі Lion Air, ахвярамі сталі 189 чалавек, а 10 сакавіка 2019 года ў Эфіопіі пры крушэнні самалёта той жа мадэлі загінулі 157 чалавек. У абодвух выпадках адбыўся збой у рабоце сістэмы паляпшэння характарыстык манеўранасці паветраных суднаў. Раней Федэральнае ўпраўленне грамадзянскай авіяцыі ЗША ўжо завяршыла працэдуру ацэнкі сістэм бяспекі самалёта. Цяперашняе тэсціраванне працягнецца некалькі дзён, і, магчыма, ужо да канца года пасля шэрагу дадатковых праверак Boeing 737 MAX вернецца ў эксплуатацыю.

На Нептуне і Уране ідуць дажджы з алмазаў

Навукоўцы даўно падазравалі, што на Уране і Нептуне могуць ісці дажджы з сапраўдных алмазаў. Цяпер гэтая здагадка атрымала яшчэ адно пацвярджэнне — прычым новыя доказы былі атрыманы вопытным шляхам. Даследчыкі амерыканскай Нацыянальнай паскаральнай лабараторыі SLAC пры Стэнфардскім універсітэце вырашылі ўзнавіць на Зямлі ўмовы, блізкія да тых, што можна знайсці ў глыбінях Урана. Зрабіць гэтае адкрыццё вучоным удалося пры дапамозе ўнікальнай апаратуры. Пры дапамозе лазера на свабодных электронах LCLS (Linac Coherent Light Source) стырол разагрэлі да тэмпературы 5000 кельвінаў (прыкладна настолькі горача будзе, калі забрацца ўглыб Урана або Сатурна на 10 тысяч кіламетраў), а ціск павялічылі да 1,5 мільёна бар, — па словах аднаго з аўтараў эксперымента, «гэта ўсё роўна што паставіць 250 афрыканскіх слоноў на пазногаць вялікага пальца». У выніку ім удалося ўбачыць, як вуглярод, што змяшчаецца ў стыроле, ператвараецца ў алмазы, а астатняя частка рэчыва выдзяляецца ў выглядзе чыстага вадароду.